нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 17 Вільня, Аўторак 31-га траўня 1927 г. Год I

Увазе выбаршчыкаў!

1, 2 і 3-га чэрвеня кожын поўналетні грамадзянін места Вільні мае права і павінен зьвярнуцца ў свой абвадовы камітэт (сьпіс іх з адрасамі раскленны на вуліцах места) і праверыць, ці сам ён, сябры ягонае сям'і ды знаёмыя правільна запісаны ў сьпіскі асоб, якім прызнана права падаць свой голас на выбарах у мястовую раду Вільні 19-га чэрвеня.

Абвадовыя камітэты адчынены ў гэтыя дні дзеля праверкі ад 3 да 10 гадзіны папалудні

Асобы, якія абмылкова, ці з прычыны адсутнасьці даных аб іх польскім грамадзянстве, акажуцца няўпісанымі ў сьпіскі выбаршчыкаў, павінны падаваць рэклямацыі ў свае абвадовыя камітэты да 6-га чэрвеня. Парадзіць і дапаможа ў гэтым Беларускі Выбарны Камітэт (вул. Субач № 2, гасьцініца Англія).

Калі пабачыце, што прапушчаны нехта з ведамых вам людзей, папярэдзьце й яго, каб падаў рэклямацыю!

Гатуйцеся да перавыбараў гмінных рад.

Сьледам за роспускам цэлага раду мястовых самаўрадаў, якія пражылі ўжо паўвойны век,—урад нарэшце падумаў і аб самаўрадах вясковых, якія ў Заходняй Беларусі наагул ня маюць нічога супольнага з самаўрадаваньнем шырокіх масаў беларускага сялянства. Загад ураду аб роспуску гмінных радаў і выбарах новых—там, дзе яны не адбываліся ў працягу апошніх трох гадоў,—гэта вялікая здабыча працоўных масаў наагул, ды нашага сялянства асабліва: перад намі паўстае магчымасьць вывясьці гаспадарчае жыцьцё вёскі з таго тупіка, у які яно загнана „самаўрадамі па назначэньню", ці то гміннымі радамі, створанымі ў ненармальны ваенны час і цалком падпарадкаванымі адміністрацыйнай уладзе — у асобах паноў старостаў.

За апошнія гады наша вёска рашуча дамагалася перавыбараў гэткіх гмінных радаў, пабудаваных на ненармальных, хваравітых падставах. Пачынаючы ад мінулае восені, асабліва многа было зроблена пастаноў сялянскіх сходаў з дамаганьнем новых выбараў. І гэта паказуе, што вёска нашая ўжо дасьпела да таго, каб узяць гмінныя самаўрады ў свае рукі.

Хай-жа гэтым летам яна пакажа гэта ня толькі на славах, але й на дзеле! Хай беларускія сялянскія масы, якія ўмелі трэбаваць перавыбараў, патрапяць і правясьці іх так, каб кіраўнічая роля ў гмінных радах апынулася ў адпаведных руках — руках працоўных. Хай усе жывыя сілы беларускае вёскі загадзя распачнуць падгатоўку да выбарнае кампаніі, каб у мамэнт, калі будзе абвешчаны дзень выбараў, было ўжо ўсё гатова дзеля сьвядомага, дружнага выступленьня працоўных масаў вёскі — з мэтай адваяваць самаўрады з варожых сялянству рук, што іх захапілі.

Беларускія працоўныя масы, якія ўжо ў 1922 годзе на заклік сваіх павадыроў так горача адгукнуліся і правялі значную лічбу паслоў у Сойм і Сэнат, — за гэтыя пяць гадоў бязьмерна вырасьлі духова і ўсьведаміся нацыянальна і сацыяльна. Дык цяперашнія выбары ў самаўрады павінны выявіць гэтую дасьпеласьць нашае вёскі.

Мы верым, што запраўды выявяць. Дык да працы ўсе,—і перамога будзе наша!

Гістарычная часіна.

Разрыў дыпляматычных зносінаў паміж Англіяй і СССР адсунуў на задні плян і як-быццам зусім закрыў сабой усе найважнейшыя падзеі і праявы жыцьця апошніх часоў. Адным махам ход палітычных падзеяў у Эўропе, а мо' і на ўсім сьвеце, рашуча зьмяніў свой кірунак. Усе палітычныя пляны і праекты, будаваныя на магчымасьці нейкага кампрамісу між Саюзам Сацыялістычных Радавых Рэспублік і капіталістычнымі дзяржавамі, утрацілі—ці мусяць утраціць усялякі грунт пад сабой, паскольку крок Англіі выкліча насьледаваньне з боку другіх капіталістычных гаспадарстваў.

Ніжэй мы падаем цэлы рад галасоў замежнае прэсы аб англійска-радавым разрыве. Тут-жа зьвернем увагу на ацэнку ўтворанага палажэньня, дадзеную аднэй з найпаважнейшых буржуазных газэт Эўропы—венскай „Нэйе Фрэйе Прэссэ".

Газэта лічыць разрыў між Англіяй і СССР „вялікай бядой для сусьветнага міру" і „адкрытым увядзеньнем клясавае барацьбы ў міжнародавую палітыку". У выніку разрыву можа „зусім счэзнуць магчымасьць навет нейкага часовага кампрамісу між капіталізмам і крайнім сацыялізмам". Калі Англія заўсёды ўскладала такія надзеі на разьвіцьцё гандлёвых зносінаў дзеля ўмацаваньня міжнародавага міру, дык цяпер сама яна рве тыя зносіны, якія за апошні час так шырока разьвілі таргова абмен між ёй і СССР... Калі Гаспадарчая Канфэрэнцыя, працуючы ў Жэнэве, ускладала такія-ж надзеі на аканчальнае ўрэгуляваньне міжнародавага рынку, дык цяпер,—зараз-жа пасьля сканчаньня яе працы, — разрыў палажыў канец і ўсім гэтым надзеям... Асабліва цяжкі разрыў для Нямеччыны, якая, так сказаць, уасабляе сабой пэўны кампраміс між капіталізмам і сацыялізмам, Захадам і Усходам... Калі-б не Нямеччына, дык можна было-б сказаць, *„сусьветны капіталізм і сусьветная рэвалюцыя стаяць цяпер тварам проці твару, азброеныя да зубоў"*. Клясавая барацьба паднята ўгару, як *лёзунг новай вайны*, як прынцып сусьветнай міжнародавай палітыкі... „Мы ня можам бяз трывогі навет падумаць аб тым, чым пагражае сьвету гэткае палажэньне. Сьвет прынцыпова пазбаўлены міру, дык мір фактычна можа быць нарушаны кожнай драбніцай"... „Мы ня бачым ніякага выхаду з гэтага тупіку", канчае газэта свае сумныя разважаньні.

У гэтых разважаньня буржуазнае газэты ёсьць, бясспрэчна многа слушнасьці. І мы мусілі-б роўна з ею трывожыцца, калі-б ня было аднаго зьявішча, якое значна аслабляе страхі венскае часопісі. Справа ў тым, што — адначасна з узростам самапэўнасьці панучае ў капіталістычных дзяржавах буржуазіі—расьце ў іх і *сьвядомасьць працоўных масаў*, расьце тая новая сіла, якой суджана будзе адыграць кіраўнічую ролю ў новай эры жыцьця сьвету, што пачалася ад мамэнту выбуху сацыяльнае рэвалюцыі ў Расеі. Увядзеньне клясавае барацьбы ў міжнародавую палітыку, аб якім піша „Н. Ф. Пр.", будзе мець той рэзультат, што і працоўныя масы ў капіталістычных дзяржавах будуць прымушаны *зьвязаць крапчэй сваю сацыяльную барацьбу з міжнародавай палітыкай*. А вынікам гэтага раней ці пазьней мусіць стацца рашучы падыход работніцкіх масаў усяго сьвету да зьдзейсьненьня лёзунгу, які напісаны на ўсіх сацыялістычных сьцягах: „Працавітая бедната ўсіх краёў, злучайся!"

Ведама, гэта не выключае магчымасьці йшчэ доўгіх новых крывавых войн.

Але адначасна з гэтым трэба прадбачыць магчымасьць і значнага завастрэньня клясавае барацьбы ў капіталістычных дзяржавах. І ад самых працоўных усяго сьвету будзе залежаць, каб вынікі гэтае барацьбы былі для іх памысныя...

Як ні як, а сучасны мамэнт запраўды-ж мае вялізарную гістарычную вагу, ацаніць якую можна будзе йшчэ ня хутка.

Дыпляматычны разрыў між Англіяй і СССР.

Англійскі парлямант адобрыў разрыў зносінаў з СССР.

26 траўня англійскі парлямант большасьцю 357 галасоў проці 111 прыняў прапазіцыю кансэрватыўнага ўраду аб разрыве дыпляматычных зносінаў з СССР і аб скасаваньні таргавай умовы з СССР. Прапазіцыя апазіцыйнай работніцкай партыі, каб сьпярша аддаць усю справу вобыскаў у парляманцкую камісію,—адкінена. Лібэралы падзяліліся: значная частка іх галасавала за разрыў.

У сваей прамове проці прапазіцыі апазіцыі Чэмбэрлен даў агляд гісторыі англійска-радавых зносінаў, сталай варожай агітацыі II Інтэрнацыяналу і радавага ўраду проці Англіі — па ўсім сьвеце, ды пры гэтым бажыўся, што „няма ніводнага слова праўды ў тым, быццам з свайго боку ён, Чэмбэрлен, стараўся ў Жэнэве ці ў Рыме стварыць проці-радавую коаліцыю дзяржаваў". „Англійскі ўрад вядзе мірную палітыку ў-ва ўсіх частках сьвету і ня зьбіраецца ўвязывацца ў проці-радавую кампанію. Англійскі ўрад лёяльна падтрымлівае Лігу Народаў" і г. д... Наадварот, радавы ўрад — адзін на ўвесь сьвет (?) — не прызнае Лігі Народаў ды—англійскага аўтарытэту... Дзеля ўсяго гэтага Чэмбэрлен — ад імя ўраду — ставіць катэгарычнае дамаганьне, каб парлямант прыняў і зацьвярдзіў пастанову ўраду аб разрыве зносінаў з СССР, пагражаючы інакш сваей адстаўкай... Пагроза адстаўкай, ведама ж была чыстым „красамоўчым спосабам", бо большасьць згары была забясьпечана ўраду.

Цікаўны для красамоўства Чэмбэрлена гэтыя месцы аб „лёяльнасьці да Лігі Народаў". Успомнім толькі, якую ролю гэтая Ліга змушана Англіяй іграць у часе, калі сябру Лігі—Кітай б'юць усе яго калегі з тэйжа Лігі, каму толькі ня лень, а Англія — першая... Што да прызнаньня Лігі ўсімі, апрача СССР, дык ізноў успомнім выхад з яе Бразыліі, Гішпаніі і інш...

Нота англійскага ўраду да СССР.

Англійскі ўрад — у выніку пастановы парляманту — зьвярнуўся да ўраду СССР з нотай, у якой, паведамляючы аб разрыве зносінаў, трэбуе, каб у працягу 10 дзён як дыплёматычнае, так і гандлёвае прадстаўніцтва Радаў у Лёндане былі зьліквідаваны, а іх пэрсанал выехаў-бы з межаў Англіі.

Разрыў Канады з СССР.

Сьледам за Англіяй, і канадзкі ўрад—пэўна-ж, пад сільным націскам англійскага,—заявіў таргавай дэлегацыі СССР аб разрыве зносінаў з СССР.

Англійская місія пакінула Маскву.

Прадстаўніцтва англійскага ўраду ў Маскве выехала ў Англію. Абарону англійскіх інтарэсаў у СССР прыняло на сябе француская пасольства.

Нямецкае пасольства мае бараніць радавыя інтарэсы ў Англіі.

Радавы пасол у Нямеччыне зьвярнуўся да Штрэзэмана з просьбай, каб нямецкае прадстаўніцтва ў Англі ўзяло на сябе абарону інтарэсаў СССР у Англіі. Штрэзэман згадзіўся на гэта.

Радавы ўрад пераводзе ўсе свае лёнданскія ўстановы ў Бэрлін.

Радавы ўрад мае перавясьці ўсе свае ўстановы з Лёндану ў Бэрлін, адкуль будзе вясьці таргавыя справы з Англіяй.

Радавыя прадстаўнікі і англійскія сацыялісты.

Англійскія правыя газэты б'юць трывогу. Быццам радавы прадстаўнік з адным вышэйшым урадоўцам пасольства зрабілі візыту англійскім павадыром сацыялістаў у парляманьце. Быццам тыя — на разьвітаньне — зрабілі ім вячэру. Гэта так абурыла кансэрватыўных паслоў, што яны маюць зрабіць запрос у парляманьце аб гэтай „здрадзе".

Надзеі на пралетарыят.

Бухарын — у апошняй прамове ў Маскве заявіў, што салідарнасьць усяго аб'яднанага ў міжнародавым маштабе пралетарыяту, які добра разумее ўсе заслугі сацыялістычнага гаспадарства СССР для сусьветнай работніцкай справы, зьяўляецца магутнай перашкодай для ўсялякіх авантураў капіталістычных урадаў проці СССР.

Першыя вынікі разрыву...

Маскоўскае радыё даносіць, што першым вынікам разрыву зносінаў з Англіяй была перадача вялізарнага заказу на машыны—не англійскім фірмам, як было праектавана, але — у іншыя краі, ды на варунках, значна выгаднейшых для СССР. Наагул, разрыў таргавых зносінаў з Англіяй выклікаў значны наплыў вельмі выгадных прапазіцыяў з цэлага раду іншых краёў...

Гаспадарчыя рэпрэсіі Радаў проці Англіі.

У сувязі з разрывам дыпляматычных і таргавых зносінаў з Англіяй, Радавы ўрад загадаў цэлы рад адпаведных рэпрэсіяў. З Масквы атрыманы ў Менску загад—устрымаць вываз лесу праз Рыгу ў Англію. Дзеля таго ўсе падрыхтаваньня да адсылкі плыты ў розных пунктах Дзьвіны спынены на месцы.

Радавы ўрад забараніў таргавым караблям захадзіць у англійскія парты. Тыя караблі, якія рэгулярна хадзілі ў Англію, атрымалі загад заходзіць у Гамбург. Урад зьвярнуўся да ўсіх радавых купцоў, каб яны не карысталіся англійскімі караблямі дзеля перавозкі тавараў.

Ці будзе вайна ў выніку разрыву.

Чэмбэрлен і Балдвін падчыркнулі абодва, што ў выніку разрыву дыпляматычных зносінаў з СССР ды адмовы ад таргавага дагавору зусім ня спыняецца наагул таргоўля з Радамі. Усе ўстановы, апрача пасольства, могуць астацца ў Англіі ды вясьці далей усе гандлёвыя інтарэсы з Англіяй. Толькі—з скасаваньнем таргавай умовы — усе прадстаўнікі і грамадзяне СССР у Англіі трацяць усялякія прывілеі, карыстаючыся толькі аховай агульных законаў краю. Чэмбэрлен падчыркнуў, што зрыў зносінаў, гэткім чынам, зусім не азначае падрыхтоўкі да вайны...

Загад па арміі Ворошылова.

У сувязі з разрывам дыпляматычных зносінаў з Англіяй—камісар ваенных спраў Ворошылов выдаў загад па арміі і флёту, заклікаючы чырвоную армію, ды марскі і паветраны флёты—да баявой гатоўнасьці дзеля абароны Радавага Саюзу. Прыняты асаблівыя меры дзеля абароны радавых партоў і граніцаў.

На ўсялякі выпадак.

З свайго боку і Рады прымаюць меры. Ворошылов з Будзённым паехалі на інспэктарскі аб'езд польскай і румынскай граніцаў. А 1-га чэрвеня, згодна з пастановай радава-

га ўраду, усяму каманднаму складу арміі і флоту будуць значна павялічаны пэнсіі. Адначасна выданы загад аб поўным прыпыненьні адпускоў у арміі. Ваенна-рэвалюцыйная Рада не прадбачыць ваенных сутычак, але—на ўсялякі выпадак—прымае меры дзеля ўсіленьня войск на граніцах, асабліва-ж на граніцы з Польшчай, спадзяючыся ажыўленьня дзеяльнасьці „паўстанчых атрадаў“.

Чычэрын едзе ў Бэрлін.

З Парыжу Чычэрын паехаў у Бэрлін, дзе маюць адбыцца вельмі важныя нарады. Трэба думаць, што Чычэрын яшчэ пакульшто ня вернецца ў ССРР, але будзе—у часе распачынаючайся сэсіі Рады Лігі Народаў — дзесьці блізка да Жэнэвы, як робіць гэта заўсёды.

Літвінов і „Правда“—аб разрыве.

„Правда“ падае ды тлумачыць размову з заступнікам камісара загран. спраў Літвіновым аб заяве Балдвіна, заяўляючы, што англійскі ўрад зьяўляецца галоўнай крэпасьцю сусьветнай рэакцыі. Англійскі ўрад маніцца навет ССРР ператварыць у калёнію англійскага імпэрыялізму, але гэта яму—ня ўдасцца! ССРР зусім ня пужаецца разрыву з Англіяй. Англійскі капіталізм за апошнія гады значна аслабеў. Наадварот, ССРР—значна ўсіліўся.

„Известия“ аб разрыве.

„Известия“ з прычыны прамовы Балдвіна пішуць:

„Заява Балдвіна раскрыла да канца для ўсяго сьвету тую агідную мешаніну бясчэснасьці, хлусьні ды крывадушнасьці, якія разам складаюць палітыку англійскага ўраду. Навет сам Балдвін прызнаў, што пастанова аб разрыве зносінаў з Радамі ня мае ніякае сувязі з рэзультатамі вобыску ў радавых установах у Лёндане. — „Дык ясна, што папросту англійскі ўрад зусім не даражыць мірам, дый што разрыў з Радамі зьяўляецца толькі ўступленьнем да новай вайны і новай інтэрвэнцыі (аружнага ўмяшацельства), за якія ўся адказнасьць падае выключна на англійскі ўрад.

Разрыў з Англіяй і — апазіцыя ў ССРР.

Газэты пішуць, быццам усе прадстаўнікі Радаў заграніцай атрымалі з цэнтру загад высьветліць урадам, пры якіх яны, як кажуць, „акрэдытаваны“,—тое новае палажэньне, якое стварае разрыў у ўнутраных настроях у ССРР.—Разрыў высуне ізноў з новай сілай левае радыкальнае крыло камуністычнай партыі, якое заўсёды імкнулася да поўнага спыненьня ўсялякіх зносінаў з буржуазным Захадам, заклікаючы ўрад да ўсіленьня рэвалюцыйнай прапаганды ў-ва ўсіх краёх...

Як ведама, сучасны ўрад умеранай большасьці камуніст. партыі ня хоча гэткага звароту ды будзе ўсімі сіламі працівіцца такому націску лявіцы. Але—ясна, наскольківактыўна-варожая палітыка Англіі робіць цяжкім палажэньне радавага ўраду...

Нямецкая прэса аб разрыве.

Нямецкая прэса піша, што можа разрыў зносінаў між Англіяй і Радамі з фармальнага боку матываваны, але—ці акажацца ён слушным ды мэтным палітычным крокам, гэта пакажа будучына. Англійскія прамыслоўцы ды банкіры вельмі засмучаны разрывам, які б'е іх па кішанёх вельмі крэпка. Трэба ведаць, што англійскі капітал значна заінтэрэсаваны ў цэлым радзе предпрыемстваў у ССРР, асабліва—у сібірскім горным промысьле. Наагул, горная прамысловасьць у ССРР фінансавана пераважна англійскім капіталам. Дык вось, уласьнікі гэтага капіталу аж дрыжаць за свае грошы, якіх лёс, асабліва яшчэ ў выпадку аружнага канфлікту,—зусім няпэўны... З другога боку, трэба думаць, што гэтыя ўклады англійскага капіталу ў радавую прамысловасьць — найлепш можа забясьпечываюць ад вайны, а прынамся—ад далейшага правакаваньня яе англійскім урадам.

Паў-урадавая газэта „Тэгліхе Рундшаў“ заяўляе, што Нямеччына падпісала з ССРР умову аб нэйтралітэце, ды з гэтай лініі ня зойдзе ніколі“.

Орган „Цэнтру“—„Германія“—піша, што можа ў сучасны мамэнт Лекарно і больш карысна для Нямеччыны, чым Рапальле, але апошняя ўмова павінна астацца ў поўнай сіле. Разрыў з Радамі — папросту нямысьлімы“. Іншая газэта піша, што ў англійска-радавым канфлікце Нямеччына павінна — якраз стаяць нейтральна пасярэдзіне, каб выступіць у ролі пасрэдніка між Захадам і Усходам. Гэткая роля — ня толькі карысна для сусьветнага міру, але няменш і для ўласных інтарэсаў Нямеччыны: „разумным пасрэдніцтвам між Англіяй і ССРР Нямеччына значна больш зробіць для адбудовы сваей волі ды магутнасьці, як... пісаньнем просьбаў да Антанты аб зьняцьці акупацыі“...

Нейтралітэт Нямеччыны.

Нямецкая афіцыёзная прэса піша ясна і выразна, што, ня гледзячы на ўсе націскі з боку заінтэрэсаваных дзяржаваў, Нямеччына ніколі не адмовіцца ад свайго сярэдняга палажэньня між Захадам і расейскім Усходам. Падставамі нямецкай палітыкі будуць надалей: Лёкарнскі Трактат і Трактат у Рапальлё. „Разброеная Нямеччына ня можа выбіраць між Захадам і Усходам“, піша адна з паважнейшых газэтаў.

Штрэзэман аб разрыве.

У апошняй прамове на навуковым зьезьдзе ў Штутгарце Штрэзэман, паміж іншым, сказаў, што ня верыць, каб разрыў між Англіяй і ССРР давёў да вайны. У кожным разе для нямецкага ўраду роля ягонага краю — ясна: калі дзьве дзяржавы стаяць адна проці аднэй, як ворагі,—адзінай задачай Нямеччыны можа быць: старацца спыніць магчымасьць вайны, ды зблізіць гэтыя дзяржавы ізноў.

Дыскусія ў францускім парляманьце.

У францускім парляманьце, пасьля дыскусіі ў справе краёвага камунізму і прамовы міністра ўнутр. спраў. Саро, сацыяліст Блюм запытаўся ў ураду аб яго паглядзе на дыпляматычныя зносіны з Радавым урадам наагул, бо з прамовы міністра Саро можна мець уражаньне аб варожасьці францускага ўраду да Радаў. Брыян адказаў, што на гэтае запытаньне адкажа—падумаўшы!

Француска-радавыя адносіны.

Парыжскі карэспандэнт „Кур. Варш.“ піша, што Чычэрын, выяжджаючы з Парыжу, заявіў, што ён зусім пераканаты ў моцы і трываласьці француска-радавых адносінаў.

Карэспандэнт аднак-жа сам ня верыць у трываласьць гэтых адносінаў. Трэба, піша ён, спадзявацца, што, прасьледуючы сваіх камуністаў, францускі ўрад павінен будзе ўвайсьці ў канфлікт з радавым урадам, які быццам падтрымлівае апошніх. У кожным разе ад'езд Чычэрына быццам касуе ўсе надзеі на тое, што перагаворы з францускім урадам пойдуць пасьпешна на новых падставах, запрапанаваных Чычэрыным.

Ну, аб тым, як пойдуць далей перагаворы, мы яшчэ нічога ня ведаем. Аб размове Чычэрына з Пуанкарэ і Брыянам навет француская прэса нічога дакладнага пакульшто сама ня ведае. Дый чамусьці паны францускія міністры пакуль-што — маўчаць.

Газэты толькі ўсьцяж імкнуцца выкарыстаць мамэнт, каб чым больш выцягнуць з народаў ССРС грошаў — за старыя пазыкі царскаму ўраду. Адна з газэтаў піша, што Пуанкарэ заявіў Чычэрыну, што ён гутарыць з ім больш як міністар фінансаў, чым як прэм'ер, дый, што „трэба перадусім заплаціць старыя даўгі“. Ну, вось ясна-ж: толькі аб гэтым і гутарка.

„Руль“ паведамляе, быццам радавы ўрад даў Чычэрыну, Сакольнікаву і Осінскаму шырокія паўнамоцтвы—рабіць уступкі Францыі, каб толькі аслабіць той удар, які нанясла Радам Англія.

Тлумачучы рэзкую прамову проці камунізму міністра ўнутраных спраў Саро, Брыян—на запрос сацыялістаў—заявіў у парляманьце, што мін. Саро, кажучы аб камунізьме, меў на ўвазе пераважна францускі камунізм, а кажучы аб „чырвонай Маскве“, разумеў — ня радавы ўрад, але III Інтэрнацыянал, з якім радавы ўрад зусім ня зьмешывае сябе сам. Калі з боку радавага ўраду будуць якія пратэсты з прычыны гэтай прамовы, тады ён, як міністар заграпічных спраў, дасьць усе патрэбныя тлумачэньні.

Варожы крок Пэрсіі.

У Маскве быццам атрымана вестка, што пэрскі ўрад зьняў радавы чырвонец з тэгеранскай біржы (Тэгеран — сталіца Пэрсіі). У гэтым Масква слушна бачыць англійскі націск на Пэрсію: Англія імкнецца да сарваньня радава-пэрскіх таргозых перагавораў.

Разрыў перагавораў з Эстоніяй.

Бэрлінскае агенцтва наказуе, быццам сарваліся перагаворы між Радамі і Эстоніяй, у справе гаранцыйнае ўмовы. Калі гэта праўда, дык ня цяжка і тут угледзіць — націск Англіі.

Цікаўныя весткі з Коўны.

У „Варшавянцы“ надрукавана:

„Наш аддзел у Вільні наказуе, што, паводле атрыманых з Коўны вестак, там адбылася — пад старшынства ген. Лодыгі — нарада беларускіх дзеячоў дзеля стварэньня аднalітага беларускага блёку. У лічбе ўчасьнікаў нарады былі: б. пасол Якавюк, Вальнец, Галавінскі, Чуткоў. У рэзультаце нарадаў прыняты гэткія пастановы:

1. Стварыць аднаіты беларускі блёк, які мае задачай — адарваньне ад Польшчы Віленшчыны, Горадзеншчыны і Наваградчыны. Пасьля дакананьня гэтага мае быць створана Літоўска-Беларуская Дзяржава.

2. Уцягнуць у беларускі блёк Беларускі Сялянскі Саюз, які працуе на тэрыторыі Польшчы.

3. Патрэбаваць ад ковенскага ўраду выдаленьня з межаў дзяржавы ўсіх прыхільнікаў б. Беларускага ўраду Ластоўскага, які, як ведама, выехаў у Менск“...

Праўдзівасьць весткі пакідаем на адказнасьц польскаё газэты, — тым больш, што літоўскае ўрадавае агенцтва „Эльта“ надовячы рашуча запярэчыла ўсім весткам аб адносінах між літоўскім урадам і б. пaслом Якавюком.

Сойм і Урад.

Канстытуцыйныя сумлівы і супярэчнасьці.

Ці будзе ўвосені распушчаны гэты Сойм ды назначаны выбары ў новы, як „хоча верыць „Роботнік“?! Ці, наадварот, як ходзяць чуткі, Сойм гэты мае быць „прадоўжаны“ яшчэ на якісь час,—на год, менш ці больш?! Наагул: што будзе з Соймам,—аб гэтым ніхто ў Польшы нічога ня ведае, але зразумела, усе цікавяцца страшэнна. Гэтыя пытаньні тым больш зразумелыя, што—як на грэх—Польская Канстытуцыя, „папраўленая“ толькі штосьці з паўгоду назад, мае ў сябе такія супярэчнасьці адносна да гэтага найважнейшага пункту жыцьця і сьмерці найвышэйшай установы ў дзяржаве, якія, ствараючы паважныя „сумлівы“ ў тасаваньні тых ці іншых загадаў Канстытуцыі, даюць, як заўсёды, залішне, вольную руку фактычнай уладзе выбіраць тое рашэньне, якое яна лічыць лепшым.

Напрыклад, арт. 11 кажа зусім выразна, што паслы Сойму (і Сэнату) выбіраюцца на 5 гадоў, лічучы ад дня адкрыцьця Сойму (і Сэнату). Гэткім чынам, акурат 20-га лістапада гэтага году ўсе паслы і сэнатары аўтаматычна—сілай канстытуцыі — трацяць свае паўнамоцтвы, і як Сойм таксама і Сэнат папросту перастаюць істнаваць, як законныя дзяржаўныя ўстановы.

Але вось арт. 25 тэй-жа Канстытуцыі кажа, што Сойм павінен быць склікаты штогодна не пазьней, як у кастрычніку—на звычайную бюджэтную сэсію, якая ня можа быць перарвана, пакуль ня будзе прыняты бюджэт.

З гэтага выходзіць, што або ўжо не пазьней, як 30-га кастрычніка, павінен быць адчынены на бюджэтную сэсію **новы Сойм**, які мае прыняць бюджэт, або — да 20-га лістапада сучасны Сойм павінен ужо скончыць усю бюджэтную працу, якая займае, паводле Канстытуцыі, ня менш, як 5 месяцаў, лічучы разам з Сэнатам. Дык трэба зараз-жа — або рабіць новыя выбары, або склікаць Сойм — на звычайную сэсію дзеля разгляду бюджэту. Але ані ўрад, ані, трэба думаць, большасьць Сойму і Сэнату — ня хочуць рабіць ні таго, ні другога. Бо-ж мае быць, здаецца, склікана цяпер толькі **надзвычайная** сэсія Сойму.

Гэткім чынам увосені і створыцца такое палажэньне, што Канстытуцыю, якая дае супярэчныя загады, прыдзецца „тлумачыць“ — згодна з фактычнай воляй улады — ураду, увосені трэба будзе — або склікаўшы ў кастрычніку Сойм, прадоўжыць яму паўнамоцтвы — супраць Канстытуцыі, або, распусьціўшы—законна памершы ўжо Сойм, залегалізаваць бюджэт—дэкрэтам п. Прэзыдэнта, нарушыўшы гэтым фактычна найважнейшае права ды самы зьмест народнага прадстаўніцтва.

Як бачым, усе гэтыя супярэчнасьці запраўды-ж даюць усё новыя падставы для фактычнай улады ў Польшчы рабіцца нейкай „надканстытуцыйнай уладай“ у краі.

Нарада соймавых клюбаў.

З пачыну эндэцкага клюбу адбылася 28 траўня нарада прадстаўнікоў польскіх клюбаў Сойму, у якой прынялі ўчасьце: ад эндэкаў—старшыня Гломбіньскі, ад хадэкаў — кс. Качыньскі, ад „хрысьціяньскіх дубадэкаў“ (абшарнікаў)—Строньскі, ад Пяста—п.п. Кернік і Дэмбскі, ад Вызваленьня—п. Багіньскі, ад „Работнікаў-нацыяналістаў“ — п. Попель і ад пэпээсаў пас. Недзялковскі. Як ведама, скажам да рэчы, эндэкі наагул не прызнаюць за нацыянальнымі меншасьцямі права займацца дзяржаўнымі справамі польскай Польшчы, дык і не запрашаюць іх ніколі на супольныя нарады „прыроджаных гаспадароў краю“—палякоў. Дык тым болей характэрна ўчасьце польскіх сацыялістаў у гэткай нарадзе польскіх нацыяналістыч. клюбаў Сойму.

Цікаўна, што ад учасьця ў нарадзе адмовіліся абодва ўрадавыя клюбы: „Клюб Працы“ і „Сялянскі Саюз“.

Нарада сьцьвярдзіла, што праект змусіць урад да скліканьня Сойму на надзвычайную сэсію, адпадае: урад быццам сам мае склікаць Сойм, і 1-га чэрвеня мае адбыцца у гэтай справе нарада маршалка Сойму з прэм'ерам. Толькі калі гэтая нарада ня дасьць пажаданых рэзультатаў, тады польскія „апазыцыйныя“ клюбы пастанавілі выкарыстаць свае канстытуцыйныя правы.

Нарада пастанавіла падтрымаць дамаганьне ППС—паставіць на павестку надзвычайнай сэсіі праект зьмены Канстытуцыі, — які б аблягчыў Сойму роспуск шляхам сва-

Агр. Уліцін.
(Перарабіў У. П.)

Суд над трохпалёўкай.

Агро-п'еса ў 1 дзеі.

(*Судовы возны прыводзіць сьведку Бурака, здаровага, у добрай вопратцы чалавека. Ен дзяржыць высокі сноп хлебных расьлін, выкі і канюшыны*). Скажэце, сьведка, сколькі ў вас зямлі, які севазварот вядзецё, які ўраджай у вашай гаспадарцы, сколькі душ сям'і, сколькі скаціны і як вы наагул жывяце?

Бурак. Усяго зямлі ў мяне, грамадзяне судзьдзі, 4 дзесяціны. Гэта вельмі мала. Скаціны маю: 4 каровы, каня, 4 авечкі, сьвіньню, двое парасят і 10 курэй. Сям'я мая складаецца з 5 душ. Зямля кепская, бедная, пескаватая.

Старшыня. Якое вы маеце прыладзьдзе для працы?

Бурак. З прыладзьдзя я маю толькі адзін плуг, ды жалезную барану, але я лічуся сябрам машыннага таварыства, дык ад таварыства карыстаюся радковай сеялкай, культыватарам лапчатым, бараной лугавой і іншымі. Апрача таго, лічуся сябрам Т-ва Беларускае Школы, дзе ў гуртку нам чытаюць, як ляпей гаспадарыць, ды выпісываю сваю часопісь „Саху“.

Старшыня. Скажэце, сьведка, які севазварот вы ведзяце?

Бурак. Ужо дзесяць гадоў вяду шасьціпольны севазварот: адно поле—папар, угноены пад азіміну выкай; другое—жыта з падсевам сэрадэлі; трэцяе—бульба з караньплодамі; чацьвёртае—ярына з падсевам канюшыны; пятае й шостае—канюшына.

Старшыня. Які ўраджай у вас з вашай гаспадаркі ад розных расьлін?

Бурак. На ўраджай мой, грамадзяне судзьдзі, жаліцца я не магу, хоць зямельку маю і благую. Як толькі перайшоў ад трохпалёўкі да шматпольля,—павялічылася ў мяне гною, пачаў я добра вырабляць зямлю, пачаліся і добрыя ўраджаі. Наагул я маю з дзесяціны: жыта—115 пуд., аўса—90 пуд., канюшыны — 300 пуд., бульбы — 900 пудоў, проса—90 пудоў. Грэчкі я ня сею, няпэўная расьліна. Яшчэ сэрадэля дае з дзесяціны 120 пудоў, буракоў 2800 пудоў. На грошы, калі пералічыць, то будзе выходзіць 477 р., але корм я скармліваю каровамі ды прадаю масла, дык выходзіць яшчэ больш. Лёну я ня сею, бо сям'я ў мяне дробная, а адзін з бабай каля яго ня справіўся б.

Старшыня. Чым вы, сьведка, дабіліся павялічэньня ўраджаю?

Бурак. Ураджай павялічыўся, калі я перайшоў ад трохпалёўкі да шматпольля, ды пачаў сеяць траву і караньплоды; гэта дало корм скаціне, а пад скацінай стала больш гною, дый лепшага. Апрача ўсяго, я добра вырабляю зямлю добрымі прыладамі.

Старшыня. Колькі гною было ў вас і які быў ураджай да пераходу на травапасеў і пасьля пераходу?

Бурак. І ўспамінаць аб ураджаі да пераходу на травапасеў не хачу. Проста сьмех і толькі: жыта — 35 пуд., аўса — гэтулькі-ж, бульбы — 400 пудоў, а гною дык і 20 вазоў ня было.

Старшыня. Скажэце, сьведка, чаму вы перайшлі на шматпольле, ад каго вы даведаліся аб ім і хто вам дапамагаў?

Бурак. На шматпольле перайшоў я вось як: з трохпалёўкай жыць стала далей немагчыма; ураджаі рабіліся горш і горш, скаціна пачала драбнець. Задумаўся я тады, што рабіць, як сабе парадзіць? Перш думаў кінуць усё і ўцякаць у горад, ці ў Амэрыку. Але неяк стала жаль кідаць сваю старонку, шкода кідаць сваю зямельку. У гэты час я пачаў выпісваць сельска-гаспадарчыя часопісі, даведаўся, што людзі інакш выробляюць сваю зямельку, што ёсьць аграномы, якія дарма вучаць сялян, як ляпей гаспадарыць, каб больш мець карысьці ад гаспадаркі. Вось, да гэткага агранома зьвярнуўся і я. Раскаэаў яму, як кепска мы жывём, і стаў прасіць, каб ён дапамог парадай. Дакляраваў яму і гасьцінца даць, — але ён толькі ўсьмяхнуўся, кажучы: „відаць з вамі ніхто ня гутарыць, пакуль не дастане хабару; але мы з табой на гэтым згодзімся, і няпэўна цябе ня скрыўджу“. Потым дадаў: „добра, склічце ў нядзелю сход, а я да вас прыеду“. Сабралі мы сход. Прыехаў і агроном, ды адразу пачаў тлумачыць, як шкодна трохпалёўка і якую карысьць дае шматпольле з канюшынай і караньплодамі. Паехаў у поле, нарысаваў нам на паперы, паказаў, як трэба падзяліць на часткі нашу зямлю, ды што на якой частцы сеяць на працягу шасьці гадоў. Парадзіў нам зямлю перш заправіць зялёным угнаеньнем-лубінам. Сказаў, як яго сеяць, дзе дастаць, як загараць насеньне і інш. Мы грамадой дасталі насеньне, пасеялі, а калі лубін падрос, тады мы яго загаралі, на ім пасеялі жыта; жыта ўрадзіла сьцяна-сьцяной, да жыта мы падсеялі сэрадэлю; калі падрасла сэрадэля, увосень мы загаралі пад бульбу, кармовыя буракі і кармовую рэпу, пасьля якіх сеялі авёс з падсевам чырвонай канюшыны. У першы-ж год канюшына дала нам 250 пудоў з дзесяціны. Адразу скаціна ў нас павесялела. Пачалі мы больш угнойваць зямлю, — павялічыліся ў нас ураджаі, і зажылі мы лепш. Цяпер я часта хаджу да хаты-чытальні, якую залажыў гурток Т-ва Беларускае Школы, чытаю розныя кніжкі аб палепшаньні гаспадаркі і выпісваю сельска-гаспадарчую часопісь. Вось і жывём цяпер весела і сыта, ды пра Амэрыку забыліся.

Старшыня. Скажэце, сьведка, як вы наладзілі машыннае таварыства і якую карысьць яно вам дае?

Бурак. Пра магчымасьць наладзіць машыннае таварыства мы даведаліся таксама ад агранома і з сельска-гаспадарчай часопісі. Мы сабраліся і пастанавілі грамадой купіць радковую сеялку, трыор, малатарню, плугі і інш. Сабралі 10 процантаў, а рэшту нам пазычылі. Цяпер мы даўно ўжо выплацілі, і машыны—нашыя ўласныя! А ведаеце, машыны вельмі карысныя. Напрыклад, сартоўка: раней сеялі сьмяцьцё, — сьмяцьцё ў нас і радзілася. Цяпер, калі чысьцім зерне, дык родзіцца чыстае жыта, а ня гірса, ды маем лепшыя ўраджаі. Вось што значыць машыннае таварыства!

Старшыня. Хто хоча запытацца ў сьведкі?

Лубіновіч. Скажэце, сьведка, ёсьць, апроч машыннага таварыства, у вас яшчэ таварыствы?

Бурак. Ёсьць Таварыства Беларускае школы, малачарскае таварыства, ды бычынае таварыства.

Сэрадэленка. Што гэта за бычынае таварыства?

Бурак. А, бачыце, мы даведаліся з сельска-гаспадарчае часопісі „Саха“, што, калі бык будзе ад добрае малочнае маткі, дык і цяляты ад яго будуць малочныя. Вось, мы грамадой і пастанавілі злажыцца ды купіць быка добрай малочнай пароды. І не памыліліся. Цераз тры гады мы ўжо мелі патомства куды больш малочнае, чым нашыя даўнейшыя кароўкі! Тады мы сталі падбіраць кароў на племя вельмі асьцярожна, ды правільна гадаваць цялят, дзяржаць жывёлу ў цёплым хляве, даваць лепшы корм. Ад га-

ей уласнай пастановы. Цікаўна, што праект прыняты з папраўкай п. Попеля, якая кажа, што, беспасрэдна пасьля такой папраўкі Канстытуцыі, Сойм мае разьвязацца. Цікаўна, што на гэта згадзіліся навет эндэкі, якія былі проці безадкладнага разьвязаньня Сойму. Гэтая ўступка эндэкаў пэпэсам пэўна аплочана адпаведнымі ўступкамі з боку апошніх—на карысьць эндэкаў.

У часе надзвычайнаі сэсіі маюць быць памагчымасьці скончаны працы—па перагляду выбарнага закону і самаўрадавых законаў.

Аднадумна была сцьверджана патрэба асобным законам пацьвярдзіць апалітычнасьць арміі і забарону асобам, якія чынна служаць у войску, прымаць учасьце ў выбарах у парлямэнт.

Нарада яшчэ раз паказала, што „апазіцыя" складаецца з усіх партыяў Сойму, апрача 2 клюбаў, з якіх першы мае 5 сяброў (ці, здаецца, пасьля апошняга выхаду—тольк 4...), а другі, здаецца каля 2 дзесяткаў.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

„Роботнік" — аб выбарах у варшаўскі самаўрад.

Цікаўны артыкул аб варшаўскіх выбарах зьмяшчае „Роботнік". Палемізуючы з урадавай газэтай „Эпоха", ён піша, што нячуваны пасьпех камуністаў выкліканы—усей палітыкай ураду, які пайшоў „шляхам Нясьвіжа", а дайшоў „да коаліцыі з манархістамі"... Чамусьці толькі орган ППС не напамінае, што — побач з „манархістамі і абшарнікамі—у гэтым „нясьвіжскім" асобным (ад народу) габінэце сядзяць і прыроджаныя пэпэсы, — былыя і чынныя.. „Варшава выбірала палітычн..." Праўда. І доказам гэтай праўды ёсьць ...10% галасоў, атрыманых урадавымі групамі, якія аказаліся „на цэлую траціну слабейшымі за камуністаў"... Варшаўскія выбары, кажа газэта, паказалі ясна, што ўрад апіраецца на „вузенечкую падставу, а з абедзьвюх бакоў яе — мора нездаваленьня"...

„Камунізм узрос". „Спарадзілі яго—крах маёвых надзеяў, расчараваньне масаў, гаспадарчая палітыка Незабытоўскага, прэсавыя дэкрэты, рэпрэсіі бяз ладу і складу, дэмагогія, за якой ня йшлі ўчынкі і рэформы, прысуд урадавага арбітражнага суда ў справе лодзкай забастоўкі, ды, урэшце, уняважненьне сьпіску камуністаў, як апошні этап на шляху вянчаньня камуністаў вянком мучанікаў"... ППС прызнае, што „частка работнікаў" галасавала за сьпісак камуністаў, — „адыйшоўшы ад камуністаў якраз у часе панаваньня сучаснага ўраду".

У канцы газэта раіць урадавым групам мець больш скромнасьці, ня прысвойваючы сабе манаполіі на дзяржаўную працу і ўладу. — бо выбары паказалі ясна, што гэтыя ўрадавыя групы — „ніштожная меншасьць"... „Польшча ня можа апірацца на аднэй дзясятай частцы грамадзян. Пасьля вайны правіць дзяржавай без падтрыманьня і даверыя масаў можна толькі спосабамі камуністаў або фашыстаў"... Але такая дыктатура ёсьць, як сьведчыць гісторыя, толькі ўступ да рэвалюцыі... „Варшава, Радом, Астровец сказалі ясна: „Ня хочам больш таго, што ёсьць"...

А нядаўна п. Недзялковскі, выступаючы заграніцай у характары прысяжнага абаронцы польскага ўраду, бажыўся, што ў склад урадавых групаў уваходзяць амаль што ня ўсе клясы насяленьня: „пэўныя адламы" буржуазіі ўсіх сартоў, зямляўласьнікаў, сялянства, навет — работнікаў, ня кажучы ўжо — аб арміі. Дык — на такой шырокай ды рознароднай сацыяльнай падставе, а ўрад м. Пілсудскага пэўна ж выражае волю амаль не ўсяго народу... А вось цяпер, праз якіх пару месяцаў, той самы, (далібог жа ж той жа самы!) пан і пасол і таварыш Мячыслаў Недзялковскі ўжо страшыць паліцыю — рэвалюцыяй!

Заграніцай.

Разгром Ханькоўскай арміі.

Лёнданскія крыніцы кажуць аб значным паражэньні чырвонай арміі (Ханькоўскай), якая вядзе бай ў правінцыі Хонан з ген. Ву-Пэй Фу. Быццам зусім разьбіта 8 армія.

Сэнсацыйны зварот.

Пэкінскія газэты паведамляюць, быццам Японія, якая дагэтуль падтрымлівала выключна Чанг Тсо-Ліна, цяпер увайшла ў паразуменьне і з Чанг-Кай-Шэкам, які — на перагаворах у Шанхаі — зрабіў Японіі рад вельмі важных гаспадарчых уступак. Дык трэба, відаць, спадзявацца націску Японіі на абодвух Чангаў, каб памірыліся...

Але вось, апошнія тэлеграмы кажуць ужо аб нечым зусім новым. Сама Японія адкрыта—актыўна і аружна—умяшалася ў кітайскія справы. Толькі што газэты паведамілі аб нейкім новым паразуменьні Японіі з Англіяй — пасьля разрыву з Радамі. І вось вынікі гэтага паразуменьня ўжо дзеюць. — Японскі ўрад, пазываючыся, ведама-ж, на „небясьпеку для японскіх інтарэсаў у Манджурыі і Шантунгу", ня толькі выслаў новую партыю войска ў Порт Артур, але адначасна зьвярнуўся з ультыматумам да абодвух ваюючых Чангаў, — каб ня сьмелі чыніць ніякіх перашкодаў ваенным апэрацыям, якія Японія прызнае неабходнымі — дзеля аховы сваіх інтарэсаў.

Чым скончыцца гэтае выступленьне Японіі, і як будуць на яго рэагаваць аслабіўшыя сябе ў узаемнай вайне кітайскія арміі,—пабачым.

Новая прамова Мусоліні.

На адчыненьні італьянскага „парляманту" Мусоліні сказаў вялікую прамову, якая цягнулася аж 2 гадзіны. „Палітычная праграма" фашыстаўскага ўраду азначана Мусоліні даволі дзіўна.—Сцьвярдзіўшы, што цяпер Італія мае 40 мільёнаў жыхараў ды толькі паўмільёна прыросту насяленьня ў год, фашыстаўскі бацька „народу" заявіў, што гэта — страшэнна малы прырост, што трэба пладзіцца хутчэй...—Трэба, каб Італія да паловы гэтага сталецьця мела ня менш, як 60 мільёнаў людзей... Тады яна лёгка пераможа ўсіх сваіх ворагаў, асабліва ж — тых, якія... блага плодзяцца.—Гэта-ж—выразны ківок у бок Францыі, насяленьне якое ня толькі не нарастае шляхам размнажэньня, а зьмяншаецца.

„Зьмяншэньне насяленьне робіць з наймагутнейшай імпэрыі—чужаземную калёнію", сільна закончыў аратар.

Наступная пагроза была скіравана яўна ў бок Нямеччыны. — Мусоліні „сцьвярдзіў" тутака, што адабраныя ад Аўстрыі (чыста немецкія) акругі—„адвечна былі італьянскімі, толькі зьнямеччаны аўстрыяцкім урадам". „Але навет, калі б у гэтых акругох жылі цяпер сотні тысячаў немцаў, усё-ж італьянская граніца там для нас—сьвятая ды непарушная. і мы будзем бараніць яе ў патрэбе аружжам, дый хаця б навет—заўтра"...

У частцы прамовы аб справах унутранае палітыкі Мусоліні зрабіў цікаўныя рэвэляцыі аб тых новых рэпрэсіях, якія тасуе ўрад ад часу апошняга замаху на асобу свайго павадыра. Уся апазіцыйная прэса падпала пад новы тэрор; усе проці фашыстаўскія партыі і арганізацыі былі зачынены; створана было спэцыяльнае „паліцэйскае бюро дзеля палітычнага нагляду" з сваім асобным „судом" і г. д... Што датычыць амністыі, дык урад мае зрабіць яе не раней, як— ...у 1932 годзе! „Наагул ня трэба навет спадзявацца, што ўрад дазволіць жыць проціфашыстаўскім часопісям ды арганізацыям у краі, дзе ёсьць месца толькі — фашыстам"...

У частцы „міжнародавай" прамовы Мусоліні, кажучы аб Лёкарно, сказаў, што асабіста паехаў у Лёкарно, каб прыняць учасьце ў важным дыпляматычным акце. Францыя пагадзілася з Нямеччынай, але на старожы гэтай умовы, як яе жандары, сталі Англія ды Італія. Але вось, два гады не прайшло ад часу Лёкарно, як ізноў дзяржавы зброяцца на сушы і на моры... Дык і для Італіі—ясна, што яна ня можа адставаць ад гэтых збраеньняў. Бо-ж толькі гэтым здабывае сабе дзяржава—гучны ды сільны голас у сьвеце...

„Нас залішне мала—дзеля выпаўненьня вялізарных задачаў, якія стаяць перад італьянскім народам". „Трэба нам быць здольнымі ў кожны патрэбны мамэнт выставіць 5 мільённую армію"...

„Італія стаіць на парозе новага парляманатарызму, які выпрацоўваем мы, фашысты — для ўсяго сьвету. Сёньня мы харонім урачыста фальшывы парлямантарызм, пабудаваны на агульным дэмакратычным галасаваньні. А ў канцы году мы ўжо апрацуем новыя яго формы, стварыўшы „корпарацыйную палату".

„Новы парлямантарызм" Мусоліні з яго „корпарацыйнай палатай" узапраўднасьці нічога новага не прадстаўляе, бо гэткі прынцып прадстаўніцтва—ад становых, прафэсіянальных ды мясцовых арганізацыяў замест палітычных партыяў, пакладзены быў даўно ў аснову так званых „другіх", ці „верхніх" палатаў і розных законадарадчых установаў пры манархах...

Прафэсар Масарык — ізноў прэзыдэнтам.

27 траўня на выбарах прэзыдэнта Чэхаславакіі ізноў выбраны праф. Масарык, які стаіць на гэтым становішчы—ад паўстаньня незалежнай Чэхаславакіі. Масарык выбраны ў першым-жа галасаваньні большасьцяй 274 галасоў на агульную лічбу—434 паслоў і сэнатараў галасаваўшых.

Праграмы і партыі.

Ня так даўно абшарніцкае „Слово", пішучы аб праграмах беларускіх хадэкаў і сельсаюзьнікаў, зусім слушна сьцьвярдзіла, што ў сваіх палітычных і сацыяльных лёзунгах партыі гэныя мала розьняцца ад грамадаўскага кірунку. Але — пацяшаў польскіх абшарнікаў аўтар стацьці (ён-жа сталы супрацоўнік „Бел. Крыніцы" і „Сялянскае Нівы") — гэты сацыяльны і палітычны радыкалізм зьяўляецца няшчырым: проста, каб мець магчымасьць вясьці канкурэнцыю з сялянска-работніцкім рухам, хадэкі і сельсаюзьнікі „падмаляваліся" на-чырвана, як ведамыя жанчыны, што па вечарох выходзяць з ведамай мэтай на вуліцы места....

Дый сваей дзеяльнасьцяй хадэкі і сельсаюзьнікі падцьвярдзілі інфармацыі свайго супрацоўніка. Для кожнага ясна, што тыя лёзунгі, якія абвяшчаюць іхныя праграмы, могуць быць зьдзейсьнены толькі шляхам барацьбы з'арганізаваных масаў сялян і работнікаў. Дык-жа сельсаюзьнікі і хадэкі зразу-ж пачалі разьбіваць сялянска-работніцкую еднасьць, цкуючы сялян проці работнікаў, а аб стварэньні запраўды-ж моцнае масавае арганізацыі—хоць бы навет чыста сялянскае— і не падумалі!*). Ясна: абедзьве гэныя партыі ўсе свае спадзяваньні ўскладаюць на ўгоду з буржуазіяй, і голас сьвядомых з'арганізаваных масаў толькі разьбіў-бы ўсе палітычныя спэкуляцыі, якімі займаюцца хадэцка сельсаюзьніцкія павадыры. Яны баяцца масы, баяцца яе радыкалізму, і ўся дзеяльнасьць іх зводзіцца да вытаргоўваньня ў тэй ці іншай буржуазнай групы, у таго ці іншага міністра — „канцэсіяў" і „авансікаў" на іх баламутную работу.

Вось чаму, ня гледзячы на свой праграмны „радыкалізм", партыі гэныя маюць поўную свабоду дзеяльнасьці. Кідаючы ў масу пекныя словы, яны **нічога ня робяць, каб словы гэныя масы-жператваралі ў дзела — сілай сваей арганізованасьці.**

Апошнімі днямі—побач з гэнымі дзьвюма **беларускімі** партыямі згодніцкага характару—стварылася на землях Заходняе Беларусі йшчэ трэцяя падобная да іх, гэтым разам—**польская**. Каб адразу заахвоціць людзей, якіх гэная новая партыя хоча ўлавіць у свае сеці, яна так і назвала сябе—„радыкальнай". Гэта—„Radykalna Partja Włościańska Ziem Białoruskich" („Радыкальная Сялянская Партыя Беларускіх Зямель"), створаная пасламі Бонам, Шапелем і Шакуном, якія, пасьля разгрому ўладай „Незалежнай Партыі Хлопскай", адракліся ад апошняе, бэсьцячы сваіх уласных дасюлешніх павадыроў. Партыя гэная, паўтараючы галоўныя лёзунгі НПХ, адначасна абвяшчае, што выракаецца старое тактыкі масавае барацьбы, бо... за гэта садзяць у вастрог! Вось, „шкадуючы" нашых сялян, якія—дзеля зьдзейсьненьня сваіх палітычных і сацыяльных ідэалаў—самі сябе не шкадуюць, новая партыя мае шукаць **новых шляхоў—такіх, проці якіх пануючая буржуазія нічога-б не магла мець..** Ясна, што гэта можа быць толькі тая ж самая тактыка **ўгоды з буржуазіяй**, якую вядуць „нашы" хадэкі і сельсаюзьнікі. Ясна такжа, што, многа гаворачы аб аб'яднаньні сялянства Беларускіх Зямель—бяз розьніцы нацыянальнасьці, паны „радыкалы" будуць даваць у сваей арганізацыі месца і... польскім асаднікам, бо ж тыя— таксама сяляне! Але гэта не перашкаджае ім у сваей адозьве, выпушчанай з дазволу дзяржаўнае ўлады, пісаць, быццам яны „змагаюцца з асадніцтвам"..., Дый шмат чаго ў гэнай адозьве чытаем такога, за што органы беларускага сялянска-работніцкага кірунку сыстэматычна канфіскуюцца і зачыняюцца, а рэдактароў засуджаюць у катаргу.

Як бачым, мы перажываем час, калі згодніцкія партыі — з дазволу буржуазнае ўлады—„падмалёўваюцца" чырвонай фарбай, каб гэтым здабыць уплывы на беларускія працоўныя масы ды аслабіць іх актыўнасьць. І гэта—цікаўная адзнака нашых часоў: яна найлепш характэрызуе настроі масаў, да якіх ня можа дступіцца ніхто, калі йдзе да іх пад чорным або белым сьцягам! Г. Б.

*) Дзеля бесстароннасьці трэ адзначыць, што сумліўна, каб і ў такім выпадку сялянства за імі пайшло!

Мы—агні.

Небасхіл ўвесь заліты агнямі —
Ён прарочыць нам лепшае дні.
Мы — агні і жывем мы агнямі,
Каб стварыць сьветазарны агні.
Нам няcтрах, што мы самі
[загінем,
Недасягшы сваей вышыні,
Але страх, па сабе ці пакінем,
Сьветазарнага шчасьця агні?!
— — — — — — — — —
Нам сьмяецца высокае неба.
Нам сьмяецца мяцежная даль,
Нам сьмяецца радзімая глеба —
І ад плуга бліскучая сталь.

Нам сьмяюцца абшары з лясамі,
Нам сьмяецца блакіт з вышыні,
Нам сьмяюцца курганы з палямі,
Нам ўсьмяхаюцца новыя дні!!!
— — — — — — — — —
Мы — агні... і жывём мы агнямі,
Каб стварыць сьветазарны агні!

18.V-27 **А. Салагуб.**

Сон.

Я сьніў, што ўзьняўся над зямлёй
І шыбануў да зорнага прастору;
Асьветленая куля мчалась прада мною
І нейкі шум ляцеў ка мне, як з мора...
Якісьці страх скаваў мне душу
І мучыла пытаньне мозг; куды
Зьліваўся ветру сьвіст у вушшу
Праснуўся я... Сьмяялась сонца з вышыні.

1927. **Хв. Ільляшэвіч.**

Хроніка.

Да справы заарыштаваных паслоў. Як мы даведаліся, судовыя сьледчыя ўлады налажылі арышт на грошы заарыштаваных беларускіх паслоў і грамадзкіх дзеячоў, якія былі паложаны на іх бягучых і тэрміновых рахунках у Беларускім Каапэратыўным Банку. Грошы гэныя, як інфармуюць сем'і заарыштаваных дзеячоў, прадстаўляюць іх прыватную маемасьць і былі зьберажэны пасламі ў працягу блізу пяцёх гадоў іхняга пасланьня. Чым тлумачыцца пастанова аб арышце гэных грошы, трудна згадаць. У іншых з іх на бягучым рахунку было ўсяго колькісот злотых...

Два „Беларускія Выбарныя Камітэты"? Як ужо ведама нашым чытачом, у Вільні заклаўся **Беларускі Выбарны Камітэт** дзеля вядзеньня выбарнае кампаніі ў мястовую раду. Камітэт зьмяшчаецца пры вул. Субач № 2 ў гасьцініцы Англія. Заклалі яго віленскія **работнікі беларусы** і прадстаўнікі беларускае **працоўнае інтэлігенцыі**. Камітэт безадкладна зарэгістраваўся ў Камісара Ураду на м. Вільню. Аб закладзінах яго было абвешчана ў нашай газэце.

Але-ж вось паны сельсаюзьнікі і хадэкі (хаця апошнія і выракаюцца ўчасьця ў выбарнай кампаніі), ведаючы, што за імі работніцкія масы ня пойдуць, надумалі зрабіць звычайнае ў іх машэнства: яны заклалі свой партыйны камітэт, ды назвалі яго — дзеля баламучаньня народу—таксама „Беларускім Выбарным Камітэтам"....

Дзеля таго, каб усьцерагчы беларускае грамадзянства ад ашуканства, выясьняем, што першы з гэтых камітэтаў—работнікаў і працоўнае інтэлігенцыі — ідзе на выбары ў блёку з работнікамі другіх нацыянальнасьцяў пад назовам „Аб'яднаны Выбарны Камітэт Сацыялістычных Партыяў і Прафэсіянальных Саюзаў". Другі—сельсаюзьніцка хадэцкі — з Ярэмічам і сэнатарам Багдановічам на чале— зсябраваўся з расейцамі і стварыў супольны з імі **расейска-беларускі камітэт**.

Паўтараем: хаця партыя хадэкаў ухілілася ад актыўнага ўчасьця ў выбарнай кампаніі, аднак у склад гэнага расейска-беларускага камітэту выдэлегавала многалетняга рэдактара свайго партыйнага органу „Бел. Крыніцы", грам. Туронка. Дык і адказнасьць за гэны камітэт нясе роўна з сельсаюзьнікамі.

На выпадак, калі-б сельсаюзьнікі ўпіраліся, што іхні камітэт закладзены раней за работніцкі,—сьцьвярджаем наперад, што адзін з галоўных прадстаўнікоў расейска-белару-

тага каровы пачалі даваць больш малака. Цяпер мае каровы даюць 180 ведзер малака, а не 50, як раней.

Старшыня (*да прокурора і абаронцы*). Ці ня маеце вы пытаньняў да сьведкі?

Прокурор. Скажэце, сьведка! Куды вы дзеяцё малако, калі ў вас 4 каровы і даюць яны па 180 ведзер малака?

Бурак. Калі пачала паляпшацца наша жывёла, і ў нас зьявіліся лішкі малака, сьпярша мы ня ведалі, што з ім рабіць, бо прадаць яго было некаму. Зьвярнуліся да агранома, ён ізноў дарма дапамог: „уладжвайцё, кажа, малачарскае таварыства". Пры ягонай дапамозе дасталі мы машыны ў крэдыт, нанялі хату, зладжылі ўмову, як гэта трэба па закону. Прыбыткі дастаём мы вельмі добрыя. Вырабляем масла, і нашае масла лічыцца ў Вільні і Горадні амаль ня самым лепшым.

Абаронец. Дазволіце запытаць сьведку?

Старшыня. Калі ласка.

Абаронец. Скажэце, сьведка, дзе вы пасяцё вашу скаціну ўлетку і як вырабляеце папар?

Бурак. Жывёлу ўлетку я нідзе не пасу і ня маю ў гэтым патрэбы, а сею для яе на папары азімую выку, якая дае вельмі добры зялёны корм. На ёй я пасу жывёлу на прывязі, як гэта гаварыў аграном; я маю 3/4 дзесяціны папару, і гэтага хапае для маей скаціны да самага часу касьбы. Каровы заўсёды сытыя і даюць шмат малака. Папар ару, як раіў аграном: пасьля выкі—ў *канцы траўня*, калі зямля яшчэ мокрая і рассыпаецца. Ару глыбока і зараз-жа бараную. Усё лета дзяржу зямлю пухкай ды чыстай ад траўя. Мяшаю тыдні за два да пасеву, каб зямля магла асесьці і ня рваць карэньні руні. Сею рана, зараз-жа пасьля першае прачыстае (15 жніўня па стараму стылю), чыстым ды здаровым насеньнем. Ураджаі ў мяне добрыя.

Трохпалёўка (*ўстаючы да старшыні*). Дазвольце, грамадзянін старшыня, зрабіць адно запытаньне сьведку.

Старшыня. Калі ласка.

Трохпалёўка. Скажэце, сьведка, ці не перагрызьлі вы сабе горла, як завадзілі шматпалёўкі, розныя бычыныя таварыствы і іншыя гаручкі? Мне здаецца, што вы вельмі многа хваліцеся сваей арганізованасьцю. Наш народ ня хоча знаць ніякіх вашых таварыстваў, апроч таварыстваў піць гарэлку, іграць у карты, ці праводзіць час ня ў чытальнях, але за плёткамі.

Бурак. Праўда, грамадзянка Трохпалёўка. Цяжка было спачатку наладжваць працу, бо наш народ ня вельмі давяраў ўсяму гэтаму новаму, няпрывычнаму. Неяк здатней спачатку яму было час каратаць у корчмах за гарэлкай, ці за картамі. Шмат спачатку было з боку нашага цёмнага суседа розных перашкод, але, як убачыў карысьць ад усяго новага, то хутка пакінуў свае дурныя прывычкі, якія ты яму прычапіла. Цяпер селянін у нашай вёсцы Весялусе інакш выглядае, інакш глядзіць на рэчы, інакш і думае. Цяпер ён кожную вольную мінуту каратае ня ў Моўшы, а ў розных хаўрусах, ці ў чытальні.

Старшыня. Больш пытаньняў да сьведкі ніхто ня мае?

Усе. Няма.

Старшыня. Сядайцё, сьведка.

(*Бурак сядае*).

(Далей будзе).

скага камітэту (ў патрэбе назаваем яго імя!) прызнаўся пры сьведках, што „мы йшчэ не з'арганізаваліся", калі даведаўся аб утварэньні працоўнымі беларусамі Беларускага Выбарнага Камітэту...

Самазванная прадстаўніцтва. Пасьля разгрому радыкальнае „Грамады" хадэкі й сельсаюзьнікі абвясьцілі сябе адзінымі прадстаўнікамі ўсяго беларускага грамадзянства— ня гледзячы на тое, што вялізарная большасьць сьвядомых беларусаў яўна варожа аднесіцца да гэных партыяў. Партыі гэныя правялі свайго чалавека ў Галоўную Выбарную Камісію ў Вільні—ведамага палянафіла Дубейкоўскага, з якім усё грамадзянства ня мае нічога супольнага, апрача толькі польска-беларускага „Інстытуту Беларускае Культуры й Гаспадаркі". А як гэны „прадстаўнік" грамадзянства павінен быў падаць Выбарнаму Камісару сьпісак беларусаў, якія ўвайшлі-бы ў раёнfamous выбарныя камісіі, дык хадэкі й сельсаюзьнікі, каб паказаць, што „за імі йдзе ўсё грамадзянства", панапісавалі кандыдатамі цэлы рад асоб, якіх аб гэта навет не папыталіся і згоды іх не атрымалі. Цяпер усе гэтыя асобы падаюць Галоўнаму Камісару заявы, што іх назначылі бяз іх згоды і ведама, ды зракаюцца назначэньня....

Перадвыбарная мана. Як буржуазіі стаіць сольлю ўвачу стварэньне Аб'яднанага Выбарнага Камітэту Сацыялістычных Партыяў і Прафсаюзаў, у які ўвайшлі і беларусы,—сьведчыць факт, што буржуазная прэса з трыумфам абвясьціла, быццам гэны камітэт ужо... разваліўся! Запраўды-ж камітэт і ня думаў разваліванца, а толькі з складу ягонага выйшла адна з жыдоўскіх групаў—эсэры. Камітэт далей істнуе і вядзе сваю працу.

10-я ўгодкі сьмерці Максіма Багдановіча ў Вільні. У суботу 28 мая Віленскі Цэнтральны Гурток Т-ва Беларускае Школы памінаў 10-я ўгодкі сьмерці Максіма Багдановіча. Саля Народнага Дому Цэнтральнага Гуртка была перапоўнена беларускім грамадзянствам, што прышло аддаць належную чэсьць вялікаму песьняру-мастаку Беларускае зямлі. Праграма вечара была вельмі багатая. Пачалася яна хаўтурным маршам, які выканаў духавы аркестр вучаняў Віленскае Беларускае Гімназіі. Пасьля гэтага былі прачытаны аж два рэфэраты: аб жыцьці і творстве Максіма Багдановіча, прачытаў д-р. Ігнат Дварчанін і „Праблема красы і мастацтва ў творах Максіма Багдановіча" — прачытаў грамадзянін Антон Луцкіевіч. Рэфэраты гэтыя паказалі прысутным, якое вялікае значэньне мае для беларускай літэратуры Максім Багдановіч і якую вялікую страту нанясла беларусам перадчасная сьмерць паэта.

За рэфэратамі ішлі дэкламацыі вершаў Багдановіча — гэтых перлаў беларускае паэзіі. Бяда толькі, што першая частка дэкламацыяў, была выканана вучнямі і вучаніцмі Беларускае Гімназіі даволі слаба, відаць, што ў гімназіі мала ўвагі зьвяртаецца на дэкламацыі. За тое другая частка дэкламацыяў ажвіла прысутных, тут новую цячыю ўнясьлі маладыя грамадзяне ды і вучні, трэба сказаць, папраўіліся. Хор пад кіраўніцтвам Грам. Шырмы выканаў вельмі ўдала творы Багдановіча пераложаныя на ноты, шкада толькі, што сьпэўных нумароў было так мала.

Закончыўся вечар агульным „Ад веку мы спалі"... і маршам духавога аркестру.

—Віч—

З Т-ва Бел. Школы.

Спэктакль у в. Скураты.

(Касаўскі пав.).

На першы дзень Вялікадня Гуртком Т-ва Беларускае Школы ў в. Скураты быў пастаўлены спэктакль. Згуляны былі п'есы: „Страхі жыцьця" Фр. Аляхновіча і „Зьбянтэжаны Саўка" Л. Родзевіча. Артысты вясковыя хлопцы і дзяўчаты, ня гледзячы на тое, што выступалі на сцэне першы раз—гулялі вельмі добра. Асабліва добра гулялі ў п'есе „Страхі жыцьця" Аўдоцьця Капітанчык у ролі Юзі і малы 11-год хлопчык Якім Мергес у ролі брата Юзі. Гледзячы на прадстаўлянае імі на сцэне гора, прысутныя забываліся, што гэта толькі на сцэне так і думалі, што дзеецца сапраўды, дзесь у хаце беднай безработнага. Добра прайшоў таксама „Зьбянтэжаны Саўка". Усе сьмяяліся да ўпаду, асабліва ў часе сцэны калі Саўка садзіўся на яйкі і калі сьляпы жабрак краў сала.

Чэсьць Вам пашыраючым родную культуру! Каб больш культурнай працы, моладзь наша ня была бы такой цёмнай, а аб п'янстве ня было-бы і паміну. **Прысутны.**

Бібліатэка-чытальня.

(Стаўпецкі пав.).

Гуртком Т-ва Белар. Школы ў в. Скорычы, Ярэміцкае гм., адчынена бібліатэка-чытальня, якая мае каля 150 кніжак беларускіх пісьменьнікаў. Усе грамадзяне азначанай вёскі і ваколічныя могуць браць кніжкі да дому і чытаць у чытальні. К Вам, грамадзяне, даем свой кліч. Памагайце пашыраць нашу бібліатэчку, хто чым можа—хто грашыма, а хто кніжкамі. Не забывайце, што той ня ёсьць сын сваей Бацькаўшчыны, хто не памагае ёй нацыянальна-культурнаму разьвіцьцю. Кніга наша сіла. Кніга наш настаўнік, з яе мы пазнаем усё: што было з чалавекам тысячу гадоў таму назад; што ёсьць на сушы ў марох і акіянах; як правадзіць культурна гаспадарку і шмат іншага. Кніга гэта страва для розуму, як хлеб для цела. Дык падтрымлівайце Вашу бібліатэку, каб у ёй былі розныя навуковыя кніжкі, каб кожны грамадзянін мог у вольныя гадзіны карыстацца кніжкаю.

Управа Скарыцкага Гуртка Т-ва Белар. Школы.

Вечарынка-спэктакль.

(Стаўпецкі пав.).

Гуртком Т-ва Беларускае Школы ў в. Скорычы, Ярэміцкае гм., дзякуючы яго актыўнай дзейнасьці, 25-га красавіка г. г. быў наладжаны спэктакль, на якім былі згуляны п'есы: „Страхі жыцьця" драма ў 3-х актах і „Зьбянтэжаны Саўка", жарт у 1-й дзеі і дэклямацыя. Народу было надта многа: гэта ўсе сяляне з нашай вёскі і ваколічных. П'есы сыграны добра. Усе прысутныя праважалі артыстаў гучнымі воплескамі і засталіся надта здаволены. Спэктакль закончыўся пад гукі струннага аркестра танцамі і лятучай поштай. На зробленыя грошы куплены кнігі для папаўненьня бібліатэкі-чытальні ў Скорычах. Шчырая падзяка п. Бірулі за памешканьне, а так-жа ўсім артыстам-аматарам, прабудзіўшым вёску ад сну. Далоў цемру! Болей сьвету ў вёску! Няхай жыве і цьвіце Беларусь!!! **Зязюля.**

Падзяка.

Гурток Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Вялікая-Кракотка, Слонімскага пав., складае шчырую падзяку сялянам вёскі Вялікая-Кракотка за ахвяры, зложаныя на бібліатэку-чытальню ў суме 45 злотых.

Абвяшчэньне.

× Гэтым Гал. Упр. Т-ва Бел. Школы падае да ведама, што білет № 2160 на імя Куляшэвіча, Міжавіцкае воласьці, Слонімскага павету, уневажняецца.

Карэспандэнцыі.

Культурна-асьветная праца ў нашым павеце пашыраецца.

(Касаўскі павет).

У вёсцы Скуратох ужо пачалася культурна-асьветнае жыцьцё: ставяцца спэктаклі, адчынена бібліатэка-чытальня, у якой ёсьць шмат беларускіх кніжак. Моладзь наша, наагул кажучы, ужо ня тая, што была пару гадоў таму назад, калі напіўшыся гарэлкі разьбівала носы адзін другому, цяпер п'янага хлопца і на лякарства ня знойдзеш. А пра дзяўчат і гаварыць няма чаго, яны разам з хлапцамі вельмі цікавяцца сваей роднай культурай, бо зразумелі, што толькі праз сваю родную культуру прыдзем мы да сьвятлейшага жыцьця, да лепшае будучыні. У той час, як гэтую сьвятую праўду ведае ў нас кожная малая дзяўчынка, кожны малы хлопчык — ня ведаюць, або ня хочуць ведаць яе нашая вясковая, так званая інтэлігэнцыя, як напрыклад вучыцелька старой расейскай школы ў нашай вёсцы — папоўская дачушка — Алена Капітанчык. Усякімі брыдкімі славамі лае яна нашую моладзь, гаворачы, што той, хто ідзе на беларускія спэктаклі, ёсьць самы апошні і нягодны чалавек і ўгаварывае нашу моладзь, каб кінула яна наша культурна-асьветнае Т-ва.

Грамадзянка Капітанчык! Пара Вам і Вашаму бацьку папу перастаць смуціць бедны беларускі сялянскі люд, бо з Вас усе, навет куры — сьмяюцца і ніхто Вас ня слухае, а толькі дзівяцца ўсе з Вашай цемнаты і сьлепаты. Відаць, Вас жыцьцё яшчэ нічаму не навучыла.

За такія пасгупкі грамадзянка Капітанчык з сваім мужам б. расейскім паштовым чыноўнікам выключаны з сяброў Т-ва Беларускае Школы яшчэ два месяцы таму назад а сяброўскія білеты іх за №№ 1938 і 1946 уняважнены. **Селянін.**

Поп і народ.

(Чарневічы, Дзісенскага павету).

Есьць у нас поп Уладзімір Сіняўскі. Служыць ён папом ужо 20 гадоў. Родам ён з вёскі Турычына, Чарнеўскай воласьці, да 1925 году служыў ён папом у м. Новым Пагосьце і да таго ўеўся ў косьці нова-пагостаўскім прыхаджанам, што яны яго ўжо даўно стараліся ўсялякімі спосабамі выкурыць з прыходу але ня надта ім гэта ўдавалася, бо заставаўся ён у іх аж да 26 году, як яны казалі, піць іх кроў. Гэты праведны айцец, як ён сябе называе, вельмі любіў выдзіраць апошнюю капейку з сялян. Калі здарацца гдзе хаўтуры і прыедзе поп хаваць, дык, увашоўшы ў хату, глядзіць, як выглядае гэта хата і якая абстаноўка, калі крышку лепшая —дык наш праведны айцец лічыць, што гэта багаты селянін і бярэ з яго аж 5 пудоў жыта; калі ж хата бяднейшая на выгляд — лічыць, што гэта селянін бяднейшы і бярэ 3 пуды жыта. За хрыст дзіцяці бярэ па таксе 5 зл. Але найлепш дык за вянец. Калі толькі маладыя і ўся дружба добра апранута, дык наш айцец не пастыдаецца сказаць: „Я ня дорага бяру, толькі пятнаццаць рублёў золатам" і канец, як ты не маліся, як не прасіся, нічога не паможа, кажа, што ён свайго слова не мяняе.

Як прыехаў гэты айцец да нас, дык людзі падумалі, што можа тут ён крыху зьменіцца, што можа будзе ўважнейшы крыху ў адносінах да сваіх людзей, бо сам-жа паходзіць з гэтай парахвіі. Але дзе ж там, далёка да гэтага, не пражыў ён у нас яшчэ і году, а ўжо называе сябе блізкім Богу, а мо' навет скора будзе і зусім сьвятым, бо ўжо зьбірае скарбонкі царкоўныя, не пабудзе ў скарбонцы доўга ні адзін грош. Сёлета перад Вялікаднём, як звычайна, складалі на плашчаніцу, дык ведама, што кожны, хто пракланяўся да плашчаніцы клаў і некалькі грошаў. А так як у нас прыход не малы, зьбярэцца каля 3.000 душ дык і злажылі тое сёе. Поп доўга ня думаючы ўзяў усе гэтыя грошы сабе, а на плашчаніцу пакінуў толькі пяць грошаў і думаў, — што ўсё будзе добра, што ніхто гэтага ня відзеў, дык ніхто і ведаць аб гэтым ня будзе. Але ня так яно сталася. Царкоўны сторож відзеў, як поп браў гэтыя грошы ды сказаў царкоўнаму старасьце. А стараста сабраў папячыцеляў і перад імі аб'явіў папу, каб той аддаў грошы на царкву, бо ведама, што гэта грошы царкоўныя. Але поп давай апраўдывацца і кажа, што ўзяў грошы на плашчаніцу, але ўкінуў іх зноў у царкоўную скрыню, што і сторож відзеў, як ён гэта рабіў. Але сторож і надалей цьвярдзіў, што ён відзіў толькі, як поп браў грошы, але, як ён кідаў іх у царкоўную скрыню, ня відзіў. За гэта поп вельмі брыдка аблаяў стоража і сказаў, што за абразу духоўнае асобы будзе ён у пекле пераносіць страшныя цярпеньні. А цяпер ня хоча прыймаць гэтага стоража на службу.

Дык вось, браточкі, паглядзіце, як папы нас навучаюць і пеклам страшаць, а самі яны што толькі ня вырабляюць!

Позны падпісчык.

Паляўнік на сялянскіх сабак.

(Нясьвіскі павет).

Абшарнік маёнтку Краснагорка прафэсар Бранеўскі сядзіць увесь час у Варшаве, дык гаспадарыць за сябе прыслаў нейкага панка, якога сяляне нашы называюць катам. Але яны яго і ня надта баяцца, дык ён, нічога ня могучы зрабіць, стараецца памсьціцца хоць на сялянскіх сабаках. Ён ловіць іх гдзе папала і страляе.

Так хацеў ён забіць сабаку селяніна Паўла Гэцмана, якога спаткаў на дворнай канюшыне. Але на шчасьце тут жа блізка быў сам гаспадар сабакі, які блізка сеяў. Дык калі гэты панок намерыўся ў сабаку, каб застраліць яго — Павал Гэцмам прыбег да яго і схапіўшы за плечы, стрымаў яго. Панок быў страшэнна нездаволены і хацеў накінуцца на Паўла Гэцмана. Але той яго не пабаяўся і вылаяў апошнімі словамі, кажучы яму, што сабакі ў нас канюшыны не ядуць дык няма за што страляць яго сабаку, калі ён узьбег на панскую канюшыну. Пану „кату" нічога не заставалася рабіць, як забрацца і пайсьці з сьцісьненымі зубамі. Але ў лесе ён спагнаў сваю злосьць на 13 гад. дзяўчыне беднай удавы Аўдолі і страшна зьбіў яе за тое, што тая хадзіла па лесе. Дык вось, як абыходзяцца розныя панкі з нашымі сялянамі і як разумеюць нашы парадкі! **Паважны.**

Усячына.

Найвялікшыя месты сьвету.

Перад вайной лічба местаў, якія мелі звыш мільёна насяленьня, не перавышала 20. Цяпер гэткіх местаў — аж 40. Гэта — яркая праява шпаркага ўзросту места ў нашыя часы — коштам вёскі.

Ведама, што такі ўзрост места мае месца перадусім у краёх з высокай прамысловосьцю, як Амэрыка, Англія, Нямеччына, у якіх —ня толькі фабрычная праца дае шмат месца для рабочых рук, але, з другога боку, тасаваньне машынаў у сельскай гаспадарцы робіць усё больш непатрэбнымі гэтыя работніцкія рукі на вёсцы.

Перад вайной найвялікшым местам у сьвеце быў Лёндан. Але сёньня Нью Іорк значна перагнаў Лёндан лічбай жыхароў, Нью-Іорк мае іх аж 9 мільёнаў 350.000, а Лёндан толькі — 7.660.000. Трэцім местам па лічбе насяленьня зьяўляецца Парыж, але Бэрлін расьце значна шпарчэй і хутка можа яго перагоніць. Першы мае 4.600.000 жыхароў, другі — 4.126 000.

Далей ідуць месты—Чыкаго з 3.600.000 жыхар., Філядэльфія — з 2.700.000, (абодва ў Амэрыцы), М. Буэнос-Айрэс у Аргентыне— 2½ мільёны, Осака ў Японіі — 2.115.000, Масква — 2.018.000, Шанхай — 2 мільёны, Токіо, сталіца Японіі, — 1.995.000, Вена — 1.900.000. Перад вайной сталіца Аўстрыі займала 7 месца, цяпер 12-ае. Бостон у Амэрыцы мае гэтулькі-ж, як і Вена. 14-ае месца займае Ленінград, які мае цяпер 1.611.000 жыхароў, значна менш у параўнаньні з даваенным часам. Пасьля, у парадку зьмяншэньня лічбы жыхароў, ідуць: Дэтройт у Амэрыцы, дзе слаўныя аўтамабільныя фабрыкі Форда, Гамбург у Нямеччыне, Пэкін, Хань-Коў у Кітаі, — усе каля паўтара мільёна; пасьля Ріо дэ Жанэйро, сталіца Бразіліі, і Калькутта ў Індыі — па 1.400.000.

Апрача гэтых 20 местаў, яшчэ 20 маюць звыш мільёна, як Бомбэй у Індыі, Будапэшт, сталіца Вэнгрыі, Лівэрпуль у Англіі — па 1.300.000; Бірмінгэм, у Англіі — 1.200.000, Афіны, сталіца Грэцыі — 1.150.000, Глэзго ў Англіі — 1.128.000, Манчэстэр, Сіднэй, Варшава — крыху больш 1 мільёна; Кантон, Нэаполь, Сан-Франціско і некалькі іншых — па мільёну. У Эўропе найбольш мільёнавых местаў мае Англія, бо аж 5.

„Дэндрограф".

Амэрыканскі вучоны Мак Дугаль зрабіў „дэндрограф" —прыладу, якая аўтаматычна вымярае зьмены таўшчыні дрэва ў працягу пэўнага часу. Нягляд за зьменамі таўшчыні дрэва мае вялікае значэньне ў масавым вучоце матар'ялу на вялікіх лясных абшарах.

Новы прамень.

Ангельскі вынаходца Бэрд дэманстраваў новы адшуканы ім прамень, які свабодна праходзіць праз густы туман. Гэта вынаходка мае аграмаднае значэньня для мараплаваньня і авіяцыі.

Паштовая скрынка.

К. Буйнаму. Вершы вашыя зьмяшчаем. Шліце больш. — **Янку Няшчаснаму.** Карэспандэнцыі Вашы ня ўсе падыходзяць да друку. — **Гебрашаву.** Ваша карэспандэнцыя нічога ня кажа. — **Прыхаджаніну.** Вашай карэспандэнцыі не зьмяшчаем, бо няма мейсца навет на важнейшыя справы як тая, аб якой Вы пішаце. — **Грамабою.** Аб тым, што Вы пішаце, ужо было зьмешчана ў адным з нумароў нашай газэты.—**Напамінайцы.** Не зьмяшчаем, бо ня хочам падвясьці газэту пад канфіскату. — **Фэльетоністу.** За Ваш фэльетон „Выпаўніў" напэўна сканфіскавалі-бы. — **А. Багдановічу.** У вершы Вашым няма паэзіі.

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын. Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.